# Дыягностыка сфарміраванасці метапрадметных кампетэнцый

## Беларуская мова, III клас

**Паважаныя калегі! У № 10/2023 былі прадстаўленыя навучальныя заданні па фарміраванні метапрадметных і асобасных кампетэнцый вучняў на ўроках беларускай мовы ў III класе. У гэтым нумары часопіса прапануўваем дыягнастычныя заданні, якія прадугледжваюць ацэнку сфарміраванасці метапрадметных кампетэнцый. Прынцыпы канструявання і логіка пабудовы навучальных і дыягнастычных заданняў ідэнтычныя, таму паспяховае выкарыстанне дыягностыкі магчымае пры ўмове фарміравання метапрадметных уменняў з дапамогай навучальных заданняў.**

Распрацаваныя дыягнастычныя заданні дазваляюць праверыць сфарміраванасць пазнавальных вучэбных дзеянняў і навыкаў работы з тэкстам і інфармацыяй, некаторых камунікатыўных і рэгулятыўных уменняў.

Дыягнастычныя заданні прадстаўлены ў дзвюх дыягнастычных работах (для першага і другога паўгоддзяў), якія можна выкарыстоўваць у працэсе індывідуальнай (самастойнай) работы на ўроках паўтарэння, абагульнення і сістэматызацыі ведаў, стымулюючых і падтрымліваючых занятках па беларускай мове.

Кожная дыягнастычная работа ўключае тэкст (тэксты) і 10 заданняў (пытанняў). Пры выкананні заданняў вучням прапануўваюцца розныя формы фіксацыі адказаў: выбар адказу (ВА), кароткі адказ (КА), разгорнуты адказ (РА).

У залежнасці ад складанасці, колькасці правільных адказаў, паўнаты прыведзенага тлумачэння заданні ацэньваюцца ад 0 да 3 балаў. За заданні на фіксацыю кароткага адказу выстаўляецца 1 бал; заданні, якія ўключаюць некалькі кампанентаў, ацэньваюцца з улікам колькасці падзаданняў. Пасля праверкі выкананай работы падлічваецца агульная сума балаў і вызначаецца ўзровень развіцця метапрадметных уменняў вучняў. Да тэкстаў прапануўваюцца шкалы ацэнкі ў адпаведнасці з трыма вызначанымі ўзроўнямі: рэпрадуктыўны, прадуктыўны, творчы. Адзначаныя ўзроўні вучэбнай дзейнасці суадносяцца з трыма групамі чытацкіх уменняў: пошук інфармацыі ў тэксце і разуменне прачытанага — рэпрадуктыўны ўзровень; інтэграванне і інтэрпрэтацыя інфармацыі — прадуктыўны ўзровень; асэнсаванне і ацэнка набытай інфармацыі — творчы ўзровень.

Час на работу з дыягнастычнымі заданнямі настаўнік вызначае самастойна з улікам падрыхтаванасці класа. Кожны вучань выконвае заданні самастойна. Перад гэтым настаўніку неабходна звярнуць увагу вучняў на спосабы фіксацыі правільных адказаў. Для выканання работы загадзя рыхтуюцца індывідуальныя аркушы з тэкстам і заданнямі для кожнага вучня ў класе.

Для настаўнікаў прапануўваюцца спецыфікацыі дыягнастычных заданняў, якія ўяўляюць сабой дэталёвае вызначэнне правяраемых уменняў на падставе адзначаных заданняў, прыкладныя апісанні варыянтаў адказу, тып задання, а таксама максімальны бал, які вучань можа атрымаць пры ўмове яго паспяховага выканання.

**Дыягнастычная работа № 1 да раздзела «Значэнне слова»**

Прачытайце тэкст.

*Аднаго разу пацікавіўся Верабейка ў Сарокі:*

*— Праўда, што ёсць словы ветлівасці?*

*— Ёсць, — пацвердзіла Сарока.*

*— Ты мне іх назаві, а я вывучу, — папрасіў Верабейка.*

*— Няма калі. Са сваякамі трэба сустрэцца, — адказала Сарока. — Я словы ветлівасці на лісток паперы напішу, а ты потым сам вывучыш.*

*Сарока запісала ветлівыя словы: «добрай раніцы», «наведвайцеся часцей», «бывайце здаровы», «усяго найлепшага», «да скорай сустрэчы», «добрай ночы», «скорай папраўкі», «даруйце, калі ласка», «не крыўдуйце», «добры дзень», «прывітанне», «дзякуй».*

*Сарока паляцела, а Верабейка словы ветлівасці стаў вучыць. Усе-ўсе вывучыў, да адзінага, так, як было напісана.*

*Выйшаў на двор, Варону сустрэў.*

*— Добрай раніцы, цётка Варона, — прывітаўся.*

*— Прывітанне, Верабейка, — зірнула на яго Варона, павярнулася і ў лес паляцела.*

*Крыху пастаяў Верабейка і пайшоў далей. Бачыць: Сінічка ляціць.*

*— Добры дзень! Куды ляціш, Сінічка? — пацікавіўся.*

*— Сябры чакаюць. У суседні лес на экскурсію хочам злятаць, — паведаміла Сінічка.*

*— Да скорай сустрэчы. Усяго найлепшага, — пажадаў Верабейка.*

*Сінічка паглядзела на яго, пакруціла дзюбай і паляцела далей.*

*«Нібы на дзівака глядзелі на мяне Варона і Сінічка», — падумаў Верабейка і паскакаў далей. А насустрач Шпак цягнецца, кульгае.*

*— Дзядзька Шпак, вам лапка баліць? — вырашыў паспачуваць Верабейка.*

*— Яшчэ як баліць! — уздыхнуў Шпак.*

*— Вы не бядуйце. Перастане.*

*— У бальніцу іду, — сказаў Шпак. — У бальніцы мне лапку абавязкова вылечаць.*

*— Скорай папраўкі, — пажадаў Верабейка.*

*Паводле А. М. Якімовіча [1, с. 20–22]*

1. Знайдзіце і падкрэсліце ў тэксце сказы, якія пацвярджаюць, што Верабейка хоча быць ветлівым.

2. У якой частцы казкі ёсць пацвярджэнне таго, што Верабейка клапоціцца пра іншых, спачувае? Выберыце і адзначце «✔» правільны адказ.

☐ Частка, у якой расказваецца пра сустрэчу з Варонай.

☐ Частка, у якой расказваецца пра сустрэчу з Сінічкай.

☐ Частка, у якой расказваецца пра сустрэчу са Шпаком.

3. Што з'яўляецца доказам таго, што Верабейка сапраўды засвоіў ветлівыя словы? Запішыце адказ.

**Адказ:** ____________________

4. З якой мэтай напісаны тэкст? Выберыце і адзначце «✔» правільныя адказы.

☐ Пазнаёміць з ветлівымі словамі;

☐ расказаць пра птушак;

☐ паказаць сітуацыі, у якіх неабходна ўжываць ветлівыя словы;

☐ расказаць пра Верабейку.

5. У тэксце сустракаюцца ветлівыя выразы і словы. Выберыце тыя з іх, якія можна ўжываць пры сустрэчы і развітанні. Запоўніце табліцу.

| Пры сустрэчы | Пры развітанні |
|---|---|
| ____________ | ____________ |
| ____________ | ____________ |
| ____________ | ____________ |
| ____________ | ____________ |

6. Падбярыце і запішыце назву да казкі.

**Адказ:** ____________________

7. Міша атрымаў заданне дапоўніць верш Уладзіміра Андрэевіча Паўлава ветлівымі словамі, якія сустрэліся ў тэксце вышэй. Дапамажыце хлопчыку выканаць заданне.

Век дзяліся тым, што маеш, —
Хлебам-соллю, казкай-краскай.
Ну а ў госці запрашаеш,
Гавары ўсім:
— ____________!
А з табой як тое будзе,
То за шчодры знак усякі
Пакланіся добрым людзям
І скажы ім шчыра:
— ____________! [2, с. 4]

8. Да чаго заклікае Уладзімір Андрэевіч Паўлаў у вершы? Сфармулюйце адказ.

Быць ________, ________, ________.

9. Уявіце, што вам неабходна звярнуцца да супрацоўніка бібліятэкі, каб знайсці патрэбную кнігу. Дапоўніце размову неабходнымі выразамі.

— ________! Скажыце, ________, дзе я магу знайсці кнігу беларускага пісьменніка Аляксея Мікалаевіча Якімовіча «Казкі-падказкі»?

— Гэта кніга стаіць на другім стэндзе на трэцяй паліцы.

— ________ за дапамогу!

10. Пра якога чалавека можна сказаць, што ён ветлівы? Запішыце адказ.

**Адказ:** ____________________

**Дыягнастычная работа № 2 да раздзела «Склад слова»**

***Тэкст № 1***

Прачытайце тэкст.

*Што такое прыстаўка? Гэта слова мае некалькі значэнняў. Гэта тое, што прыстаўлена, далучана да чаго-небудзь. Ёсць і іншае значэнне — частка слова, якая стаіць перад коранем. Мы прыстаўляем яе*

*да каранёў і атрымліваем словы з новым значэннем: -бег — **па**бег, **пры**бег, **вы**бег, **пера**бег і інш.*

*Ёсць у беларускай мове слова верыць — быць перакананым, упэўненым у чым-небудзь. Калі трэба ўпэўніцца ў правільнасці чаго-небудзь — трэба **пра**верыць. А калі і праверка не дала жаданых вынікаў — трэба праверыць яшчэ раз, **перапра**верыць. Вось і атрымалася слова з дзвюма прыстаўкамі.*

1. Колькі значэнняў мае слова прыстаўка? Абвядзіце лічбу з правільным адказам.

1 2 3

2. Запоўніце схему з апорай на прапанаваны тэкст.

частка ←—— прыстаўка ——→ знаходзіцца
________ ________
утварае________

3. Пра што новае вы даведаліся з тэксту? Запішыце адказ.

**Адказ:** ____________________

4. Алеся размеркавала словы на дзве групы. Адзначце «✔» групу слоў з дзвюма прыстаўкамі.

| | |
|---|---|
| бессардэчны | бязвыхадны |
| бяскрылы | безразмерны |
| бясстрашны | беспрасветны |
| ☐ | ☐ |

**Тэкст № 2**

Прачытайце размову, якая адбылася ў класе.

*— Падабраць магчымыя прыстаўкі да аднаго кораня не так ужо лёгка, — прызнаецца Вадзік.*

*— А падабраць патрэбную прыстаўку да пэўнага слова ў пэўным тэксце — яшчэ цяжэй, — пацвярджае Таня. — Калі пішу сачыненне ці расказваю што-небудзь — памыляюся, не тыя прыстаўкі ўжываю. Праўда, Ася Пятроўна?*

*— Так, — згаджаецца настаўніца, — і не толькі ты. Каб не памыляцца, трэба дакладна ўяўляць сабе сэнс слова, змест усяго выразу, якія хочаш сказаць ці напісаць. І, вядома, сэнс самой прыстаўкі.*

*— А хіба прыстаўкі маюць сэнс? Гэта ж не цэлыя словы, а толькі часткі слоў.*

*— А вось паслухайце, я прачытаю вам адну гісторыю.*

*Настаўніца прачытала загаловак «Ці ведаеш ты пра?..» і зрабіла паўзу. Пасыпаліся пытанні: пра што? пра каго?*

*— Пра... — паўтарыла яна, — проста пра.*

*— Ёсць, здаецца, такая рэчка...*

*— Так, у Разанскай вобласці. Але не аб ёй будзе гутарка, а...*

*— Ёсць прыстаўка **пра-**! І прыназоўнік, — здагадаўся нехта.*

*— Вось-вось, — падхапіла настаўніца, — прыстаўка. Паслухайце, што яна расказвае пра сябе:*

*«Часцей за ўсё я далучаюся да дзеясловаў. Я надаю слову пэўнасць, удакладняю яго ўспрыманне; адзначаю закончанасць дзеяння (**пра**гнаў), працягласць ў часе (**пра**блукаў), адлегласці (**пра**плыў) і інш. У мяне, як і ў кожнай прыстаўкі, свае магчымасці і абавязкі, а мяне часам прымушаюць выконваць чужыя або блытаюць. Напрыклад, ёсць слова **па**верка (пераклічка), а некаторыя вучні гавораць і пішуць **пра**верка.*

*Акрамя дзеясловаў вы можаце сустрэць мяне ў назоўніках, прыметніках».*

*В. І. Паўлоўская [3, с. 109, 110]*

5. З якой мэтай настаўніца расказала вучням гісторыю? Адзначце «✔» правільны адказ.

☐ Паказаць, што ў беларускай мове шмат слоў з прыстаўкай *пра-*;

☐ пазнаёміць са значэннем прыстаўкі *пра-*;

☐ навучыць адрозніваць прыстаўку *пра-* ад прыназоўніка *пра*.

6. Што неабходна ведаць, каб дакладна ўжываць словы ў размове? Знайдзіце і падкрэсліце адказ на пытанне ў тэксце.

7. У тэксце адзначаецца, што словы «паверка» і «праверка» маюць розныя значэнні. Складзіце і запішыце сказы з гэтымі словамі.

**Адказ:** ____________________

8. У залежнасці ад значэння дзеясловаў, якое надае ім прыстаўка *пра-*, размяркуйце іх на дзве групы.

*Праляцець, прагрэць, прасеяць, праскочыць.*

________ ________
________ ________

9. У тэксце адзначаецца, што прыстаўка *пра-* сустракаецца і ў назоўніках. Знайдзіце і падкрэсліце лішні назоўнік у прапанаваным радзе слоў.

*Прадзед, прадавец, праўнучка, прарадзіма, праўнук.*

10. Запішыце два пытанні, на якія вы хацелі б атрымаць адказ па тэме прапанаваных тэкстаў.

**Адказ:** ____________________

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Якімовіч, А. М. Ветлівыя словы: казкі : для дзяцей малодш. шк. узросту / А. М. Якімовіч ; маст. М. Навіцкая. — Мінск : Народная асвета, 2019. — 39 с.
2. Паўлаў, У. А. Хто знае — адгадае: вершы, забаўлянкі-пазнаванкі, загадкі, казкі : для дзяцей / У. А. Паўлаў. — Мінск : Юнацтва, 1997. — 112 с.
3. Паўлоўская, В. І. Мова: цікава і займальна / В. І. Паўлоўская. — Мінск : Народная асвета, 1989. — 221 с.

**Н. М. АНТАНОВІЧ,**
загадчык кафедры беларускага
і рускага мовазнаўства
факультэта пачатковай адукацыі БДПУ,
кандыдат педагагічных навук, дацэнт



*У мультымедыйным дадатку — карткі з дыягнастычнымі заданнямі для вучняў, спецыфікацыі дыягнастычных заданняў для настаўнікаў.*